


## ТОЛЬКІ ФАКТЫ

◆ Да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі на тэрыторыі раёна не было цэментных калодзежаў. На ўсю вёску — адна-дзве копанкі.

**Зараз на кожныя два-тры двары ёсць свой калодзеж. Усяго налічваецца 7645 калодзежаў, у тым ліку 5244 цэментныя.**

**У раёне маецца 90 артэзіянскіх шчылін. У 58 з іх абсталявана падача вады прадпрыемствам і жывёлагадоўчым фермам па вадаправодах.**

◆ У царскай Расіі на аднаго чалавека выдаткоўвалася на медыцынскую дапамогу 69 капеек у год.

**Цяпер на гэту мэту выдзелена каля 24 рублёў на кожнага жыхара раёна.**

◆ Да рэвалюцыі ў Старобіне працавала ўсяго адна прымітыўная бальніца на 5 ложкаў. Працавалі ж у гэтай бальніцы адзін урач і тры фельчары, якім неабходна было аказаць дапамогу ў радыусе 60 кіламетраў.

**Цяпер у Салігорску і раёне дзейнічаюць 11 бальніц на 930 ложкаў і 27 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 11 здраўпунктаў. У іх працуе 157 урачоў і 626 сярэдніх медыцынскіх работнікаў.**

◆ **Шырокае развіццё атрымала ў раёне донарства. Толькі ў 1966 годзе далі сваю кроў бескарысна многія сотні донараў.**

◆ **На тэрыторыі Старобінскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення ідзе будаўніцтва тыпавога двухпавярховага будынка ўчастковай бальніцы, разлічанай на 35 ложкаў. На яе будаўніцтва выдаткавана звыш 170.000 рублёў.**

**У другім паўгоддзі пачне таксама працаваць участковая бальніца на 15 ложкаў у вёсцы Гоцк.**

# НА ВАРЦЕ ЗДАРОЎЯ ЧАЛАВЕКА

## ЭКСКУРС У МІНУЛАЕ І СУЧАСНАЕ РАЁНА

Неяк будучы ў Чапялях, нам давялося чуць успаміны старэйшага калгасніка Арэшкі. Яны адносяцца да тых далёкіх дарэвалюцыйных год.

...На вуліцы лютуе сцюжа. У доме Баранчыкаў, што ў вёсцы Чапялі, не заўважаюць холаду. Усім горача. Толькі на ложку пад коўдрай уздрыгвае жанчына. Усю ноч прасядзела сям'я над хворай. Ніхто не самкнуў вачэй. Раніцою ёй зрабілася яшчэ горш.

— Давай, браток, вязі ў горад да доктара, — пусціўшы за сабою ў хату клубы марозу, сказаў сусед. — Ідзі бяры майго каня і хутчэй у дарогу. А я тут дапамагу сабраць хворую.

Дарога не блізкая: 20 кіламетраў да Слуцка на кані! А дзе ж выйсце? Думаць доўга не прыходзілася. Выбару не было. Паблізу ж ніводнага медыцынскага работніка. А з хваробай, як з тым агнём, у гульню не гуляюць.

Толькі не давялося давезці жанчыну да гарадскога ўрача. На паўдарозе яна сканала. І гэта не адзінкавы выпадак.

Так было...

Бязрадасна і цяжка жылося людзям да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аб медыцынскай дапамозе насельніцтву царскі ўрад, памешчыкі не клапаціліся. У межах нашага раёна на пяць валасцей быў толькі адзін фельчар. Вядома, ён не мог аказаць медыцынскую дапамогу насельніцтву ў радыусе 60 кіламетраў. Аб прафілактыцы і гаварыць не прыходзілася.

Цемната і галеча, адсутнасць медыкаў прыводзілі да працвітання шаптуноў і знахароў. Гэтыя гора-лекары «лячылі» ўсе хваробы загаворваннем і кровапусканнем. Яны распаўсюджвалі павер'е ў лекавае значэнне так званага «каўтуна», які раней быў так шырока распаўсюджан на тэрыторыі беларускага Палесся.

Вялікае распаўсюджванне сярод насельніцтва мелі такія хваробы, як туберкулёз, трахома, венерычныя і інфекцыйныя захворванні, лютавалі эпідэміі дызентэрыі і тыфаў, малярыі і воспы.

У 1908 годзе ў мястэчку Старобіне ў невялікім прыватным доміку была адкрыта бальніца на 5 ложкаў. У ёй працавалі адзін урач і тры фельчары. Хворых клалі са сваімі падушкамі і посцілкамі.

Паўсюдна лютавалі эпідэміі, якія ўносілі мноства жыццяў. Вельмі высокай была дзіцячая смяротнасць.

У гады першай сусветнай вайны медыцынская дапамога яшчэ больш пагоршылася. Аказвалася яна ў Старобінскай воласці адзіным фельчарам, які па хваробе не быў прызваны на фронт. Страшэнныя эпідэміі сыпнога тыфу праносіліся ў перыяд акупацыі раёна белапольскімі наймітамі.

Адразу ж пасля выгнання белапалякаў і ўстанаўлення ў раёне Савецкай улады былі прыняты меры па ліквідацыі лютаваўшых эпідэмій і паляпшэнню медыцынскага абслугоўвання. У чэрвені 1924 года быў створан раённы аддзел аховы здароўя і адкрыта раённая бальніца.

Год ад году расшыралася медыцынская сетка,і ў 1930 годзе ўжо працавалі 7 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, а потым чатыры ўрачэбна-амбулаторныя ўчасткі. У вёсцы Даманавічы і мястэчку Пагост былі адкрыты сельскія бальніцы на 15 ложкаў кожная. Вялікая прафілактычная работа, рост кадраў медыкаў дазволілі рэзка знізіць захворванні сярод насельніцтва. Ужо да 1941 года ў медыцынскіх установах раёна працавалі 10 урачоў і каля 100 сярэдніх медыцынскіх работнікаў. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны многія медыкі аказвалі дапамогу раненым і хворым на франтах і ў партызанскіх атрадах.

Велізарны ўрон быў нанесен медыцынскім установам у час нямецка-фашысцкай акупацыі. Па сутнасці яны былі спалены і разбураны, дапамогу насельніцтву аказвалі медыкі партызанскіх атрадаў, падпольшчыкі.

У пасляваенны перыяд была праведзена вялікая работа па аднаўленню і далейшаму расшырэнню сеткі медыцынскіх устаноў, па ліквідацыі санітарна-эпідэміялагічных вынікаў вайны і акупацыі. Асабліва хуткімі тэмпамі развіваліся лячэбна-прафілактычныя ўстановы пасля таго, як пачалося будаўніцтва нашага горада Салігорска.

У цяперашні час у 6 участковых, Старобінскай, Чырвонаслабодскай і Салігорскай бальніцах разгорнута 930 ложкаў (9,2 ложка на 1000 чалавек насельніцтва). У раённай бальніцы, дзе знаходзіцца 450 ложкаў, аказваюцца ўсе віды кваліфікаванай медыцынскай дапамогі, у тым ліку: траўматалагічным, вушным, нервовым, уралагічным хворым. Вядучыя бальніцы, асабліва Салігорская, аснашчаны навейшай апаратурай і абсталяваннем для дыягностыкі і лячэння хворых. У хірургічных і акушэрска-гінекалагічных аддзяленнях трох бальніц у мінулым годзе было зроблена каля тысячы складаных аперацый. Для забеспячэння насельніцтва медыкаментамі працуюць дзевяць аптэк.

Немалую лячэбна-прафілактычную работу сярод насельніцтва праводзяць 2 паліклінікі, 27 фельчарска-акушэрскіх пунктаў і больш 10 здраўпунктаў. Вялікія поспехі дасягнуты ў галіне аховы мацярынства і дзяцінства. Штогод насельніцтву ўтвараюцца масавыя прафілактычныя прывіўкі, якія забяспечылі ліквідацыю дыфтэрыі і тулярэміі, зніжэнне коклюшу, туберкулёзу і іншых захворванняў.

На варце аховы здароўя гарадскога і вясковага насельніцтва стаіць 157 урачоў (1 урач на 660 чалавек) і 626 сярэдніх медыцынскіх работнікаў. Насельніцтва з любоўю ўспамінае медыкаў, якія доўга працавалі на ніве аховы здароўя, а зараз — на заслужанай пенсіі: Сцяпана Ігнатавіча Вялічку, Леаніда Кандратавіча Бычэню, Фёдара Іванавіча Дзялендзіка і іншых. Шмат жыццяў выратавалі ўрачы муж і жонка Пётр Аляксандравіч Гецман і Марыя Іванаўна Бобрык, якія працуюць у Старобінскай бальніцы з 1935 года. Больш 25 гадоў аддалі справе аховы здароўя працоўных урачы Іван Сцяпанавіч Барадзін, Лідзія Давыдаўна Корбут, фельчары Вольга Сямёнаўна Канаплянік і Вера Іванаўна Кучарэнка, акушэрка Таццяна Міхайлаўна Прыма, медыцынскія сёстры Вера Лявонаўна Сяргіеня, Алена Кліменцьеўна Мазанік і многія іншыя.

Можна назваць дзесяткі медыкаў, што з вялікім натхненнем працуюць і зараз, якія не лічачыся ні з часам, ні з цяжкасцямі прыходзяць на дапамогу хворым. Ніколі не забываецца першая запаведзь, якой вывучыліся медыкі, будучы яшчэ студэнтамі. Яна абвяшчае: у любых абставінах, пры першым кліччу хворага адгукніся на яго просьбу і аднясіся да яго так, як бы ты хацеў, каб аднесліся да цябе ў час хваробы!

Ёсць яшчэ захворванні, супраць якіх бяссільна медыцына. З усякімі хваробамі і з усякімі хворымі прыходзіцца мець справу ўрачу. Тым і цяжкі яго абавязак, што лячыць патрэбна не толькі хваробу, але і хворага, нярэдка не толькі фізічна, але і маральна.

Урачам часта прыходзіцца ўступаць у адзінаборства са смерцю. З усіх сіл і да апошняй мінуты ўрач заклікан змагацца за жыццё хворага. Наўрад ці можна перадаць тыя перажыванні пацыента і ўрача, калі яны абое аб'яднаны агульным жаданнем перамагчы хваробу.

І яны перамагаюць. Хваробы адступаюць перад такімі вопытнымі медыкамі, як хірургі Дзмітрый Іванавіч Міцура, Віктар Адамавіч Лукашэвіч, педыятры Алена Дзмітрыеўна Рымжа, Аляксандра Антонаўна Карніенкава, Таццяна Рыгораўна Шарупіч, акушэры-гінеколагі Ганна Іосіфаўна Салановіч, Міхаіл Іванавіч Сеўрук, тэрапеўты Лідзія Яфімаўна Судзілоўская, Іван Фёдаравіч Муравейка, Марыя Уладзіміраўна Пятровіч і многія іншыя.

**А. АДАРЧАНКА.**
**Л. КРЫВАБЛОЦКАЯ.**

## *ПАДЗЯКІ МЕДЫКАМ*

**У рэдакцыю прыйшло шмат пісем, у якіх чытачы выказваюць падзякі медыкам за чулыя адносіны да хворых і клопаты аб іх лячэнні.**

**Чытачы Трухан, Царык, Рудзеня, Тройніч з вёскі Крушнікі добрым словам надзяляюць фельчара Лістападавіцкага фельчарска-акушэрскага пункта Еву Барадка. Жыхарка г. Салігорска Ева Кірылаўна Патапіна выносіць шчырую падзяку ўрачу-уролагу Ю. А. Баранаву. Урачам Доўгаўскай бальніцы Алейчыку і Каспяровічу дзякуе рабочы БМУ А. Крукові, а брыгадзір калгаса «Чырвоны пуцілавец» Ніна Слагада ад імя аднавяскоўцаў просіць перадаць падзяку фельчару пункта А. Ф. Расцянковай.**



*Аперацыйная. Цішыня. Людзі ў белых халатах схіліліся над аперацыйным сталом. Іх чацвёра, але яны павінны дзейнічаць як адзін, усе іх рухі павінны быць узгоднены.*

*НА ЗДЫМКУ злева: аперацыю вядуць урач Салігорскай бальніцы Дзмітрый Іванавіч Міцура (у цэнтры), злева ад яго — Вільгельм Іосіфавіч Шаціла, хірургічная сястра Алена Губская, справа — урач-анастэзіёлаг Анатоль Юр'евіч Баравік.*

*НА ЗДЫМКУ справа: лабарант-рэнтгенолаг Старобінскай бальніцы Лідзія Савічна Глухоўская.*

*Фота М. Ткачэні і В. Жэбіта.*

